# Школьныя тэатры аднагадовых настаўніцкіх курсаў і гімназіі ў Дзвінску ў 1920–1930-я гады



**АЛЕКСІНА Іна Антонаўна** – старшы выкладчык кафедры тэатральнай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры, кандыдат мастацтвазнаўства

У 1920 годзе Дзвінскі, Люцынскі і Себежскі паветы Беларусі адышлі да Латвіі. Аднак на яе тэрыторыі, згодна перапісу насельніцтва, праведзенаму ў тым жа годзе, пражывала каля 100 тысяч беларусаў[1]. Дзякуючы дэпутату сейма паэту і драматургу Я.Райнісу, які ўзяў на сябе абарону правоў беларускай меншасці, урад дазволіў адкрыць пры Міністэрстве асветы Латвіі беларускі аддзел на чале з настаўнікам С.Сахаравым. У сувязі з гэтым на латышскіх землях пачынаюць актыўна дзейнічаць беларускія таварыствы, арганізоўваюцца беларускамоўныя выданні, працуюць бібліятэкі, дзіцячыя сады, адкрываюцца настаўніцкія курсы для выкладчыкаў беларускай мовы і літаратуры, дзве гімназіі, дзесяткі школ, што спрыяе актывізацыі і аматарскага тэатральнага руху. Тэатральныя гурткі ствараюцца ледзь не пры кожнай навучальнай установе і культурна-асветнай арганізацыі. Аснову рэпертуару такіх гурткоў складаюць творы беларускай драматургіі. Сярод любімых аўтараў В.Дунін-Марцінкевіч, Янка Купала, У.Галубок, Ф.Аляхновіч. Пры гэтым больш ставяцца творы Ф.Аляхновіча, бо яго п'есы адпавядалі патрабаванням часу, былі напісаны "... сучаснікам для сучаснікаў ды мелі моцны нацыянальны стрыжань і цвёрдую гістарычную глебу"[2].

**Асабліва значнай, на нашу думку, па ўплыву на тэатральную культуру Заходняга Паазер'я (або Прыдзісенскага рэгіёна) з'яўляецца дзейнасць драматычных гурткоў беларускіх аднагадовых настаўніцкіх курсаў і беларускай дзяржаўнай гімназіі ў Дзвінску.** Неабходна заўважыць, што менавіта дзвінскі гурток настаўніцкіх курсаў паклаў аснову для стварэння Беларускай драматычнай дружыны "Бацькаўшчына" ў Вільні. Праца гэтага таварыства, якое мела вялікую падтрымку з боку Я.Райніса, таксама характарызуецца накіраванасцю на адраджэнне нацыянальнай самасвядомасці беларусаў і павагі да сваёй гісторыі і культуры, на памнажэнне духоўнай спадчыны продкаў. Таму і рэпертуар тэатральнага калектыву, які дзейнічаў пры таварыстве "Бацькаўшчына" ў межах Латвіі, складаецца толькі з твораў беларускіх класікаў і сучаснікаў. Пры гэтым пачэснае месца зноў жа займае драматургія Янкі Купалы і Ф.Аляхновіча.

**Галоўная роля ў стварэнні драматычнага калектыву пры Дзвінскіх настаўніцкіх курсах належыць К.Б.Езавітаву.** Ён быў першым беларускім генералам, ваенным міністрам у часы Беларускай Народнай Рэспублікі і Беларускай цэнтральнай рады, перакладчыкам, гісторыкам, публіцыстам, педагогам, першым біёграфам Ф.Аляхновіча і іншых дзеячаў нацыянальнага адраджэння. Як арганізатар і кіраўнік курсаў Канстанцін Барысавіч не толькі падтрымаў ініцыятыву стварэння драмгуртка пры курсах, да чаго прычыніліся І.Дварчанін і Заліўскі, але і сам ахвяраваў значную грашовую суму для пачатку дзейнасці калектыву[3]. Пазней К.Езавітаў выступіў у друку з артыкулам "Спробы беларускага нацыянальнага тэатра ў Латвіі", у якім вызначыў мэты дзейнасці настаўніцкіх курсаў, сярод якіх значнае

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

месца адводзілася "кааперацыі і пастаноўкам беларускіх спектакляў"[4]. Многія слухачы гэтых курсаў раз'язджаліся па школах у правінцыі і рабілі спробы ўласных пастановак. Працавалі выпускнікі курсаў не толькі ў латвійскай правінцыі, але і ў Прыдзісенскім рэгіёне. К.Езавітаў лічыў, што "... кожны беларускі вучыцель павінен наладзіць каля сваёй школы драматычны гурток беларускай моладзі, у які павінна ўвайсці ... наогул усё маладое грамадства нашае вёскі"[5]. На думку дырэктара курсаў, драматычны гурток пры беларускай школе здольны не толькі аб'яднаць вакол настаўніка моладзь рознага ўзросту, зрабіць яго асобу карыснай і папулярнай, але і "... адыграе вялікую ролю ў справе нацыянальнага самаўсведамлення беларускага сялянства, не кажучы аб усім вядомым культурным уплыве тэатру на людскую масу"[6]. Таму на працягу наступных чатырох гадоў (1921–1925 гг.) у многіх вёсках, якія мелі беларускамоўныя школы, слухачы і выпускнікі настаўніцкіх курсаў ствараюць драмгурткі. З-за недахопу нацыянальных п'ес многія кіраўнікі драматычных калектываў займаюцца перакладамі на родную мову твораў рускай, польскай, латышскай, чэшскай драматургіі.

**У Дзвінску першы беларускі спектакль, наладжаны слухачамі настаўніцкіх курсаў, адбываецца летам 1921 года. Кіруюць гуртком Заліўскі і І.Дварчанін. За лета і восень гэтага года гурток дае дзевяць спектакляў, у час зімовых канікул ладзіць яшчэ тры пастаноўкі.** Выступленні курсантаў карыстаюцца поспехам і выклікаюць цікавасць да іх творчасці не толькі інтэлігенцыі, але і сялян. Акрамя стацыянарных паказаў гурток арганізуе паездкі па правінцыі. Лепшай пастаноўкай гэтага перыяду К.Езавітаў лічыць спектакль "На Антокалі" Ф.Аляхновіча, пастаўлены на сцэне дзвінскага тэатра "... з удзелам добрага аркестру"[7]. На адной з пастановак п'есы прысутнічаў міністр асветы Латвіі прафесар Даўге, "... які вельмі задаволіўся спектаклем, дзякаваў артыстам і абяцаў беларусам усялякую дапамогу"[8].

**З пачатку 1922 года ў сувязі з заканчэннем вучобы на настаўніцкіх курсах кіраўнікоў гуртка яго ўзначалілі Я.Камажынскі і Э.Будзько. Пазней (з 1927 г.) Я.Камажынскі працаваў дырэктарам і рэжысёрам Беларускага народнага тэатра ў Рызе пры Таварыстве беларускага тэатра ў Латвіі.**

Творчасць тэатральнага калектыву настаўніцкіх курсаў характарызуецца вяртаннем да традыцыйнай формы "беларускіх вечарынак", якія нязменна завяршаліся сумеснымі спевамі і танцамі ўдзельнікаў спектакля і гледачоў. Курсы не мелі сваёй сцэнічнай пляцоўкі, прадстаўленні ладзіліся ў памяшканні латгальскага таварыства "Саўле". Яго сцэна не была прыстасавана для буйных драматычных пастановак, таму рэпертуар гуртка настаўніцкіх курсаў складаўся ў пераважнай большасці з "мініяцюрных камедыяк", напрыклад, такіх, як "Чорт і баба", "На вёсцы" Ф.Аляхновіча, "Пасланец", "Конскі партрэт" Л.Родзевіча, "Модны шляхцюк" К.Каганца. "... Пастаноўкі былі зроблены вельмі старанна, і заўсёды маленькая зала была паўнюсенька гледачамі"[9].

У тым жа 1922 годзе пачынае сваю дзейнасць і драматычны гурток Дзвінскай дзяржаўнай беларускай гімназіі. Дарэчы, гэта навучальная ўстанова была асноўным беларускім культурна-асветным цэнтрам у Латвіі. Спачатку яе ўзначальваў Я.Красоўскі, потым С.Сахараў. Вялікая ўвага надавалася мастацка-эстэтычнаму выхаванню вучняў. Акрамя драматычнага гуртка дзейнічаў балетны, працавалі балалаечны аркестр і хор, выдаваўся рукапісны часопіс "Школьная праца". У ліку тых, хто скончыў гімназію, былі пісьменнікі, паэты, перакладчыкі – П.Масальскі, В.Вальтэр, У.Пігулеўскі, В.Вайцюлевіч, В.Казлоўская, оперная спявачка Н.Нікалаева-Камісар[10].

**Працай гімназічнага драмгуртка кіравала настаўніца і вядомая беларуская актрыса П.Мядзёлка-Грыб.** Выступленні трупы І.Ц.Буйніцкага, на якіх яна ўпершыню пазнаёмілася са сцэнічным мастацтвам, не прайшлі бясследна для маладой дзяўчыны. Як і "бацька беларускага тэатра", П.Мядзёлка прыходзіць да ідэі нацыянальнага адраджэння праз адмаўленне ад польскага і рускага асяроддзя. У перыяд вучобы ў прыватнай жаночай гімназіі ў Вільні яна знаёміцца з Янкам Купалам, А.Бурбісам, Ядвігіным Ш., А.Пашкевіч (Цёткай), З.Бядулем, К.Каганцом, бярэ ўдзел у працы Беларускага музычна-драматычнага гуртка. Менавіта яе Паўлінка з аднайменнага спектакля, які гурток беларускіх студэнтаў паказаў на пецярбургскай сцэне ў 1905 г., атрымала высокую ацэнку і ад гледачоў, і ад аўтара п'есы. Пазней П.Мядзёлка-Грыб бярэ ўдзел у рабоце Першага таварыства беларускай драмы і камедыі пад кіраўніцтвам Ф.Ждановіча.

Вопыт акцёрскай працы спатрэбіўся настаўніцы і ў кіраванні драмгуртком і хорам дзвінскай гімназіі. Праз два месяцы пасля адкрыцця гімназіі гуртkoўцы паказалі купалаўскую "Паўлінку" і "складаны феерычны балет" "Сон у купальскую ноч" невядомага аўтара. На заканчэнне хор гімназіі выканаў шэраг беларускіх песень[11].

Гімназія мела спецыяльна пабудаваную сцэну, што давала гурткоўцам магчымасць звяртацца да больш буйных твораў беларускіх і іншых аўтараў. Рэпертуар драмгуртка ў канцы 1922 – пачатку 1925 года складаюць "Паўлінка" Янкі Купалы, "Хам" паводле Э.Ажэшкі, "Сённяшнія і даўнейшыя" К.Буйло, "Чырвоны млын" (аперэтка ў 3 дзеях), "Пашыліся ў дурні" М.Крапіўніцкага, "Страхі жыцця", "Птушка шчасця", "На вёсцы", "Дрыгва", "На Антокалі" Ф.Аляхновіча і шэраг аднаактавых п'ес.

Паказы, якія заўсёды праходзілі з поспехам, адбываліся не толькі ў Дзвінску, але і ў Краславе, Рэзекне, Бароўцы, Рызе. Высокую ацэнку дзейнасці дзвінскіх гімназістаў пад кіраўніцтвам П.Мядзёлкі-Грыб давалі беларускамоўныя рыжскія выданні. У прыватнасці, газета "Беларуская доля" сцвярджала, што "... навучэнцы беларускай дзяржаўнай гімназіі ў Дзвінску здолелі стварыць вакол сябе паважаны асяродак мастацкай працы"[12]. Не менш

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

высокую ацэнку атрымала дзейнасць гэтага гуртка і ад К.Езавітава: “... некаторыя пастаноўкі па сваёй прыгажосці зрабілі б годнасць не толькі вучнёўскай сцэне, але і сапраўднаму тэатру”[13]. Сярод найбольш здольных удзельнікаў аўтар артыкула адзначае акцёрскія работы Нікалаевай, Бедавай, Мазалеўскай, Юркевіча, Карнавухава.

Гэты творчы калектыў мог бы дасягнуць значных поспехаў і ў далейшай працы на глебе беларускага сцэнічнага мастацтва, калі б не сацыяльна-палітычныя ўмовы. П.Мядзёлку-Грыб паліцыя бярэ пад нагляд, потым яе арыштоўваюць “за падрыўную дзейнасць супраць латышскіх улад” і праз некаторы час высылаюць у Савецкую Беларусь[14]. Гурток пэўны час працягваў падрыхтоўку спектакляў без свайго кіраўніка. Уплыў асобы і светапогляду П.Мядзёлкі-Грыб на ўдзельнікаў драмкалектыву выяўляецца і пазней, калі частка аматараў тэатра выбірае сцэнічную творчасць сваёй прафесіяй. Іншыя ж бяруць удзел у беларускіх арганізацыях ў Латвіі, дзейнасць якіх у 1929 г. скіравана на арганізацыю Дзён беларускай культуры. Праграма складалася з драматычнага прадстаўлення, харавых і сольных спеваў, выступлення чытальнікаў, танцаў. Паездкі з такімі праграмамі практыкаваліся не толькі на тэрыторыі Латвіі, але і ў межах Прыдзісенскага рэгіёна. Напрыклад, 4 ліпеня 1929 г. у в. Баруны Браслаўскага павета праводзіцца Дзень беларускай культуры, арганізаваны латвійскімі беларусамі з Дзвінска. Праграма выступлення складалася з паказу спектакля па п'есе Ф.Аляхновіча “На Антокалі” і выступлення хору гімназіі. На вечарыне прысутнічалі больш за 150 чалавек. Гэта і іншыя выступленні карысталіся поспехам у гледачоў.

Такім чынам, нельга не заўважыць таго станоўчага ўплыву, які аказала дзейнасць школьных тэатраў настаўніцкіх курсаў і гімназіі ў Дзвінску на станаўленне і развіццё нацыянальнага прафесійнага тэатральнага мастацтва ў Беларусі. Безумоўна, уплыў гэты быў не прамы, а ўскосны і праявіў сябе пераважна праз падрыхтоўку кіраўнікоў першых беларускіх самадзейных драмкалектываў, рэпертуар і сцэнічная творчасць якіх была накіравана на адраджэнне роднай мовы, культуры, мастацтва.

[1] *Жыццё беларуса. 1925. № 9. С. 4.*

[2] *Герасімаў В. Дачыненні між двума волатамі // Тэатральная Беларусь. 1995. № 4. С. 23.*

[3] *Там жа.*

[4] *Езавітаў К.Б. Спробы беларускага тэатра ў Латвіі // Голас беларуса. 1925. №2. С. 2.*

[5] *Там жа. С. 1.*

[6] *Там жа.*

[7] *Там жа.*

[8] *Герасімаў В. Дачыненні між двума волатамі. С. 23.*

[9] *Езавітаў К.Б. Спробы беларускага тэатра ў Латвіі // Голас беларуса. 1925. №2. С. 2.*

[10] *Кожан К. Беларусы ў Латвіі: гісторыя і сучаснасць // Браслаўскія чытанні: Матэрыялы IV навукова-краязнаўчай канферэнцыі. 24—25 крас. 1997 г. Браслаў, 1997.С. 162—163.*

[11] *Беларуская школа ў Латвіі: Папулярна-навуковы, педагагічны і літаратурна-грамадскі штомесячнік. 1932. № 7. С. 249.*

[12] *Беларуская школа ў Латвіі: мастацкая праца // Беларуская доля. 1925. № 2. С. 4.*

[13] *Езавітаў К.Б. Спробы беларускага тэатра ў Латвіі // Голас беларуса. 1925. № 2. С. 2.*

[14] *Голас беларуса. 1932. № 1. С. 2.*

## Начальное музыкальное образование: состояние и перспектива развития

*Продолжение. Начало на стр. 12.*

В этой связи целесообразным представляется проведение повсеместного перепрофилирования детских музыкальных школ в школы искусств, в которых осуществлялось бы комплексное эстетическое воспитание и обучение. В этих школах наряду с работой музыкальных классов могут и должны функционировать классы по вышеобозначенным специальностям.

В этом плане показателен пример детской музыкальной школы № 1 города Пинска. Наряду с традиционным музыкальным обучением здесь уже несколько лет на полном самообеспечении успешно работает эстетический центр, на базе которого осуществляет свою деятельность эстрадная студия. Широкое распространение получила работа классов ускоренного обучения игре на музыкальных инструментах. Начала функционировать студия журналистики для старших школьников, организованная совместно с редакцией газеты «Пинский вестник». Все это позволяет не только сохранить контингент школы, но и значительно повысить интерес родителей и детей к обучению.

Расширение профиля образовательной деятельности школ, безусловно, повлечет за собой некоторую структурную перестройку, потребует решения кадровых вопросов и обновления материально-технической базы.

Проводимые преобразования помогут решить проблему сохранения и приумножения контингента учащихся, приобщения к занятиям всех слоев населения, создания новых рабочих мест для преподавателей. Это должно отразиться и на материальном благосостоянии учебных заведений. В отличие от музыкального образования, которое в основном построено на индивидуальной работе педагога с учеником и поэтому является дорогостоящим, обучение в классе хореографии или другой специальности основано на работе преподавателя с группой, и себестоимость его ниже. А это позволит более гибко подойти к определению стоимости обучения, сделать его полностью самоокупаемым и даже частично покрыть затраты бюджета на музыкальное образование.

Потребует некоторого переосмысления и содержательная сторона учебно-воспитательного процесса в музыкальных школах. Учебные планы и объем часов в программах по отдельным предметам, по всей вероятности, требуют корректировки в сторону уменьшения. Ежедневная занятость в музыкальной и общеобразовательной школах в настоящее время лишает детей не только свободного времени, но и создает чрезмерные перегрузки, что отражается на их здоровье.

*Р.А.Жабинский, директор Брестского музыкального колледжа им. Г.Ширмы.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ